Семінар-практыкум у снежні 2020 года для рэспубліканскай творчай групы настаўнікаў замежных моў «Развіццё маўленчай мысліўнай дзейнасці вучняў сродкамі вучэбнага прадмета “Замежная мова”»

Хадасевіч Г.С., метадыст
УВМР АПА

Праведзены майстар-класы для ўдзельнікаў рэспубліканскай творчай групы настаўнікаў замежных моў. Па англійскай мове правялі майстар-класы настаўніца англійскай мовы ДУА “Сярэдняя школа № 4 г.Івацэвічы” Шабан Святлана Леанідаўна аб нацыянальным кампаненце па нацыянальных падручніках і настаўніца англійскай мовы ДУА “Гімназія № 1 г.Баранавічы” Гумінская Аксана Пятроўна аб навучанні ў супрацоўніцтве. Адметнай рысай з’явілася ўдасканаленне маўленчай мысліўнай дзейнасці вучняў пры засваенні нацыянальнага кампанента вучэбнай праграмы на ўроках англійскай мовы.

Цікавы майстар-клас правялі настаўніца англійскай мовы ДУА “Гімназія г.Астраўца” Ляшчэўская Наталля Назараўна, Гульпа Галіна Сяргееўна, настаўніца французскай мовы ДУА “Гімназія № 1 імя акадэміка Карскага г.Гродна”. Займальна, творча ўдзельнікі майстар-класа сфарміравалі сацыяльна-каштоўнасныя якасці асобы вучняў з дапамогай творчых заданняў.

Аб развіцці творчых асаблівасцей вучняў на ўроках замежнай мовы правялі заняткі ў форме майстар-класа настаўнікі іспанскай і французскай мовы ДУА “Гімназія № 2 г. Ваўкавыска” Касталомава Юлія Уладзіміраўна, Лобач Ала Афанасьеўна. Самым галоўным аспектам творчых асаблівасцей з’яўляецца латэральнае мысленне вучняў адносна іх стандартнага падыходу ў адукацыйным працэсе.

Напрыканцы семінара-практыкума ў рамках міжнароднага праекту “Кніга міра” арганізавала майстар-клас настаўніца нямецкай мовы Стэльмачонак Аліна Міхайлаўна, ДУА “Зяленкаўская дзіцячы сад-базавая школа імя Т.С.Марыненка Полацкага раена”. Сутнасць праекта – даследчая дзейнасць магчымасцей вучняў і настаўнікаў па выхаванні патрыятычных пачуццяў да сваёй Малой Радзімы. У міжнародным праекце прынялі ўдзел настаўнікі і вучні з Італіі, Паўднёвага Цiроля, Косава, Харватыі, Мексікі, Славакіі, Туніса, Рэспублікі Беларусь.

